■ Энергетыка і экалогія

АД ПРЭТЭНЗІЙ ДА КАНСТРУКТЫЎНАГА ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ

Да запуску БелАЭС плануецца як мінімум тры візіты інспектараў МАГАТЭ

Вынікі шостай нарады бакоў па Канвенцыі Эспа (дакументе аб ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе ў трансгранічным кантэксце) задаволілі беларускую дэлегацыю, адзначыла на сустрэчы з журналістамі першы намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь Ія Малкіна.

Удзельнікі нарады, якая праходзіла ў Жэневе (Швейцарыя), падвялі вынікі дзейнасці, прынялі некалькі значных рашэнняў, а таксама падрабязна абмеркавалі пытанні ўздзеяння на навакольнае асяроддзе пры рэалізацыі праектаў у галіне гідра- і ветраэнергетыкі і асаблівасці ўжывання Канвенцыі Эспа для розных праектаў у сферы энергетыкі, у тым ліку ядзернай.

— Па выніках выбараў у працоўныя органы канвенцыі ў іх склад увайшоў і прадстаўнік Беларусі, — расказала Ія Малкіна. — Гэта вельмі добрая ацэнка нашай дзейнасці. Тым больш што беларускія эксперты зрабілі вялікі ўклад у ліквідацыю існуючых недакладнасцяў ва ўжыванні Канвенцыі Эспа.

Беларусь заўсёды актыўна ўдзельнічае ў міжнародным супрацоўніцтве. З 2001 года, калі яна яшчэ не з'яўлялася ўдзельніцай канвенцыі, тут прымаліся на нацыянальным і міжнародным узроўні заканадаўчыя, адміністрацыйныя і іншыя захады па забеспячэнні эфектыўнай ацэнкі ўздзеяння на навакольнае асяроддзе. З 2009 па 2010 гг. у нашай краіне прайшла рэформа нацыянальнага заканадаўства з улікам уласнай і міжнароднай практыкі, якая сёння дэманструе свае пазітыўныя вынікі.

Па словах першага намесніка міністра, гэты факт пацвярджаюць і міжнародныя эксперты. Так, аналіз нацыянальнага заканадаўства Рэспублікі Беларусь у сферы ацэнкі ўздзеяння на навакольнае асяроддзе, праведзены камітэтам па ажыццяўленні Канвенцыі Эспа, паказаў, што паміж працэдурай правядзення дзяржаўнай экалагічнай экспертызы ў Беларусі і канвенцыяй адсутнічаюць неадпаведнасці.

Адным з асноўных для Беларусі пытанняў, што разглядаліся падчас нарады, стала скарга з боку Літвы, звязаная з будаўніцтвам Беларускай АЭС.

Як расказала Ія Малкіна, па выніках абмеркавання і галасавання нарада бакоў ухвалі ла праект рашэння ў дачыненні да Беларусі з улікам прапаноў Еўрапейскага саюза. Нягледзячы на некаторыя разыходжанні з пазіцыяй нашай дэлегацыі, прынятае рашэнне ў цэлым задаволіла беларускі бок.

Так, нарада бакоў даручыла камітэту па ажыццяўленні канвенцыі прааналізаваць зробленыя літоўскім і беларускім бакамі крокі і прадставіць даклад па гэтым пытанні на сёмай сесіі.

Акрамя таго, краіны — удзельнікі канвенцыі заклікалі Беларусь у якасці меры па павышэнні даверу між бакамі запрасіць місію МАГАТЭ па ацэнцы пляцоўкі будучай атамнай электрастанцыі, прыроднага ўздзеяння на гэтую пляцоўку і запасу трывалasці АЭС у сувязі з гэтым уздзеяннем. Беларуская дэлегацыя згадзілася ажыццявіць гэту прапанову.

Як адзначыла першы намеснік міністра, наша краіна даўно супрацоўнічае з МАГАТЭ, у тым ліку і па пытаннях па рэалізацыі нацыянальнай ядзерна-энергетычнай праграмы. Місіі міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі ўжо неаднаразова наведвалі Беларусь. Да запуску ў эксплуатацыю Беларускай АЭС плануецца яшчэ тры візіты міжнародных экспертаў.

— Калі гэтых місій недастаткова, мы гатовыя пайсці насустрач і запрасіць яшчэ адну, — сказала Ія Малкіна. — Галоўнае, каб гэта спрыяла дасягненню кансэнсусу і ўзаемнай зладжанай працы, у тым ліку і з Літвой. Нарада бакоў, якая адбылася, выразна прадэманстравала, што літоўскаму боку пара пераходзіць да канструктыўнага ўзаемадзеяння з нашай краінай — мы адкрытыя для дыялогу і гатовыя да сумеснай працы.

Вераніка КОЛАСАВА

ПЛЯЦОЎКА ДЛЯ ДЫЯЛОГУ

Фотадзымкі Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Медыяфорум стаў аўтарытэтнай пляцоўкай, якая ахоплівае не толькі Садружнасць Незалежных Дзяржаў, але і краіны Еўрасаюза, Блізкага Усходу, Лацінскай Амерыкі, — заявіла выступоўца. — Упэўнена, пленарнае пасяджэнне, панельныя дыскусіі, эксперт-сесіі, Летняя школа журналістыкі паслужаць кансалідацыі медыясупольнасці на прынцыпах аб'ектыўнай і адказнай журналістыкі». У цэлым жа форум не толькі дазваляе наладжваць прафесійныя кантакты, але і садзейнічае лепшаму ўзаемапаразуменню паміж дзяржавамі. Нагадаем, на форум прыехалі ўдзельнікі з Расіі, Украіны, Казахстана, Азербайджана, Арменіі, Балгарыі, Венгрыі, Ізраіля, Кітая, Кыргызстана, Малдовы, Латвіі, Літвы, Польшчы, Сербіі, Таджыкістана, Турцыі, Узбекістана, Францыі, Эстоніі…

Назва форуму — «Партнёрства ў імя будучыні» — вызначана парадкам дня XXI стагоддзя. «Сумленная і праўдзівая журналістыка сёння як ніколі патрэбна краінам і народам, — лічыць Лілія Ананіч. — Журналістыка накіраваная на аб'яднанне намаганняў міжнароднай супольнасці ў вырашэнні самых складаных задач сучаснасці». Што да працы беларускіх сродкаў масавай інфармацыі, то Лілія Ананіч упэўнена — яны павінны быць прыкладам патрыятычнай журналістыкі.

АД ПАРАЗУМЕННЯ ДА СІМПАТЫІ

Рыгор РАПОТА, дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, адказваючы на пытанні журналістаў пра ролю медыяфоруму ва ўзаемапаразуменні паміж краінамі, заявіў, што любыя зносіны, любы дыялог дапамагаюць лепш зразумець адзін аднаго… «Ёсць такая жыццёвая праўда: стасункі даюць паразуменне, а апошняе выклікае сімпатыю», — аргументаваў ён.

Каментуючы тэму медыяфоруму — «Рэаліі глабальнага свету», Рыгор Рапота заўважыў, што яна вельмі шырокая. «Таму з аднаго боку ёсць мінус: складана засяродзіць увагу на нейкай адной тэме, звязанай з глабалізацыяй, — патлумачыў ён. — І разам з тым мы маем магчымасць выбраць нешта такое, што больш за ўсё цікавіць аўдыторыю. На маю думку, такой тэмай з'яўляюцца інтэграцыйныя працэсы, бо нядаўна было падпісана вельмі значнае пагадненне аб стварэнні Еўразійскага эканамічнага саюза».

Гаворачы пра асвятленне сродкамі масавай інфармацыі сітуацыі ва Украіне, дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы выступіў з пазіцыі таго, што любая падзея павінна быць паказана з розных бакоў. «Ва Украіне склалася канфліктная ўнутраная сітуацыя, трывогу выклікаюць чалавечыя ахвяры. Рашэнне ж праблемы пачынаецца з усведамлення рэалій. Каб пабудаваць правільны дыялог, трэба ведаць, што рухае і адным бокам, і другім. І калі ва Украіне не будзе дыялогу, вырашэння праблемы я не бачу». Тое, што сітуацыя ва Украіне цікавая для прэсы, Рыгор Рапота лічыць вельмі натуральнай з'явай. «Сродкі масавай інфармацыі імкнуцца разабрацца ў тым, што з'яўляецца матывам усіх бакоў, якія ўдзельнічаюць у гэтым канфлікце, — так і павінна быць. Думаю, што палітыкі таксама імкнуцца ў гэтым разабрацца і знайсці найбольш прымальнае рашэнне. Тым не менш рашэнне праблемы, я думаю, можа быць знойдзена толькі ўнутры Украіны».

Ці ёсць будучыня ў журналістыкі ў век блогераў і сацыяльных сетак, калі кожны, хто мае доступ у інтэрнэт, можа надрукаваць інфармацыю пра падзею, сведкам якой ён стаў, напісаць артыкул са сваім бачаннем пэўнай праблемнай сітуацыі? Рыгор Рапота лічыць, што такая прафесія не можа знікнуць. «Чалавецтва заўсёды будзе мець патрэбу ў інфармацыі, — аргументуе ён. — Адпаведна, павінен быць і носьбіт гэтай інфармацыі». Няважна, ці будуць тыя, хто пастаўляе інфармацыю, называцца журналістамі, або яшчэ неяк — сама прафесія, яе сутнасць будзе запатрабавана ў грамадстве.

ВОЗЬМЕМ ПЛЮСЫ АД ГЛАБАЛІЗАЦЫІ

Уладзімір ГАРКУН, першы намеснік старшыні Выканаўчага камітэта — выканаўчага сакратара Садружнасці Незалежных Дзяржаў, сярод плюсаў глабалізацыі назваў амаль бязмежныя магчымасці, што адкрываюцца перад дзяржавамі і іх грамадзянамі: развіццё інтэграцыйных аб'яднанняў, кампаній, грамадскіх структур. «Разам з тым менавіта з развіццём глабальнага свету ў наш ужытак увайшлі такія паняцці, як міжнародны тэрарызм, транснацыянальная злачыннасць, наркатрафік, — дадаў ён. — У такіх умовах менавіта сродкі масавай інфармацыі фарміруюць сацыяльнае асяроддзе, грамадскую ацэнку падзей».

Выступоўца заўважыў, што супрацоўніцтва ў галіне сродкаў масмедыя мае асаблівае значэнне для дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў. «Паспяхова працуюць Савет кіраўнікоў дзяржаўных інфармацыйных агенцтваў, Савет кіраўнікоў дзяржаўных і грамадскіх тэлерадыёарганізацый, — паведаміў ён. — Важным кірункам узаемадзеяння ў галіне СМІ з'яўляецца стварэнне агульнай інфармацыйнай прасторы Садружнасці. Праца ў гэтай сферы ўжо прынесла добрыя вынікі — у 2004 годзе была створана Асацыяцыя нацыянальных інфармацыйных агенцтваў краін СНД, стужка навін якой дазваляе рэгулярна абменьвацца матэрыяламі і фотаздымкамі аб падзеях Садружнасці».

* * *

Падчас перапынкаў удзельнікі гутарылі з калегамі, абмяркоўвалі праблемы, узнятыя на пленарным пасяджэнні, абменьваліся кантактамі… Нехта ўдзельнічае ў Мінску на сустрэчах з калегамі ледзь не кожны год, шмат людзей прыехала ўпершыню — форум сапраўды набірае абароты. Будзем спадзявацца, што такія сустрэчы наблізяць нас да ідэалаў журналістыкі, бо добрае насенне дае добры ўраджай.

Надзея ЮШКЕВІЧ.

КАМЕНЮ — ЖЫЦЬ, «КУСТУ» — ЗЕЛЯНЕЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На жаль, з года ў год носьбітаў жывой традыцыі застаецца ўсё менш, а мясцовая моладзь неахвотна пераймае спадчыну матуль і бабуль. Каб не даць «кусту» «засохнуць», у Камень на свята прыехаў студэнцкі дэсант будучых фалькларыстаў. Камень зноў абудзіўся рэхам сівой мінуўшчыны, заспяваў галасамі продкаў.

«Пасвыла волы з вэчора да повночы,
Дай напала тумань на мої чорны очі.
Дай не так на очі, як на мою жовту косу,
Шчо я молодая вінчыка не доношу…»

У карагодзе пад гэтую песню каменьскія дзяўчаткі апранаюць сваю сяброўку ў «кусту», абвіваюць яе кляновым лісцем. «Куста» — сімвал прыроды і роду. Сёлета пабыць у ролі гэтых сімвалаў выпала Ірыне Рабкавец — юнай удзельніцы гурта «Багатуха». Для яе, калі накладвалі на галаву вянок, кранальна спявалі:

«А я моладая вінчыка доносыла,
Своіх сусідочок на вэсілле просыла…»

Разам з каменьскімі ўдзельніцамі абраду карагодзілі і спявалі і ўдзельніцы сталічнага студэнцкага гурта «Этнасуполка». Год таму яны ўпершыню прыехалі ў фальклорную экспедыцыю, запісвалі песні, слухалі традыцыйнае гучанне ў выкананні мясцовых пяюх. Цэлы год асвойвалі тыпавы напеў, звыкаліся з каменьскім дыялектам, каб навучыцца адпавядаць мясцовай абрадавай этнафоніі. Студэнткі-чацвёртакурсніцы відавочна хваляваліся: ці атрымаецца зліцца ім з галасамі «Багатухі»? Асабліва перажывала Вераніка Анцілеўская, паколькі сваю дыпломную працу яна вырашыла пісаць менавіта на матэрыяле куставога абраду. І якая была яе радасць, калі адчула, наколькі добра «Этнасуполцы» ўдалося наблізіцца да выканальніцкай манеры і адчуць душу песні, з якою «куст» уваходзіць у кожны вясковы двор:

«Повэдэмо куста дай на пэршы дэнь Тройцы,
Дай вынэсь пані хоць по сорокуўцы.
Заўемо вэнка із зылёного клёну,
Дай вынэсь пані хоць по золотому…»

Пачуўшы спевы, гаспадары спяшаюцца на ганак вітаць галасісты гурт, бо прыход «куста» — добрая вестка і самыя лепшыя спадзяванні на добрае лета, на тое, што будзе багаты ўраджай, што абмінуць хату бяда і ліха, не пераступяць парог хваробы. Жанчыны абавязкова просяць «куста» паспяваць і іх гаспадарам — у Камені на Тройцу прынята ўганаровываць песнямі гаспадара, паколькі на ім трымаецца і падвор'е, і хата, і поле. Вяскова-студэнцкі гурт спяваў руплівым і дбайным гаспадарам асабліва ўрачыста:

«А ў нашага дзядзіка хорошэнько на дворы,
Стоіць чэрэмшына по корынечку в моры.
А з-под чарэмшэнькі да сокол вылетае,
А ў нашага дзядзькі всэ подвор'ічко зэяе…»

Пасля гэткіх прысвячэнняў «артыстаў» шчодра адорваюць гасцінцамі. Калі «куста» пакажа здольнасць танчыць, тады траецкім гасцям дарога за… стол — з чаркай і добрымі прысмакамі. Дагэтуль у Камені лічаць, што «куст» на двары — як Бог у хаце. Нягледзячы, што хрысціянская вера даўно перамагла многія паганскія звычаі, каменьскі «куст» займеў сваё пачэснае месца ў ланцужку вясковых побытавых святаў і не дынансуе з рэлігійным жыццём.

— Наколькі моцныя нашыя людзі ў веры, нагэтулькі трывала яны захоўваюць і старажытныя традыцыі, ушаноўваючы сваіх продкаў, — кажа мастацкі кіраўнік народнага гурта «Багатуха» Марыя Чабанюк. — Мы перакананы, што наша агульнанацыянальная культура грунтуецца менавіта на мясцовай традыцыйнай культуры, якую трэба ўсяляк падтрымліваць, захоўваць і развіваць.

Марыя Уладзіміраўна вельмі ўдзячная студэнцкаму дэсанту за падтрымку ў правядзенні абраду. Са старшым выкладчыкам кафедры этнафоніі і фальклору Мінскага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Тацянай Пладуновай у яе склаліся самыя творчыя адносіны, цяпер плануюць разам правесці чарговую фальклорную экспедыцыю.

— Ужо дзесяць гадоў наша кафедра ладзіць засваенне студэнтамі этнафоніі шляхам назірання і непасрэднага ўдзелу ў абрадавых дзеяннях, — кажа Таццяна Пладунова. — Але набыты і засвоены песенны матэрыял мы імкнемся вяртаць у тое самае асяроддзе, адкуль яго чэрпалі. Бо вельмі важна не даць знікнуць жывым традыцыям. Сённяшнія вёскі, у тым ліку і Камень, маюць патрэбу ў гэткай донарскай падтрымцы.

Не будзе перабольшваннем назваць вёску Камень краевугольным каменем у падмурку храма народнай культуры Заходняга Палесся. Па-першае, гэта адно з найстаражытнейшых паселішчаў, якое археолагі адносяць да перыяду ранняга жалезнага веку. Ад далёкіх продкаў і дайшлі да нашага часу шматлікія абрады, гучаць галасамі мінуўшчыны лепшыя песенныя ўзоры, у якіх цяпер з'явіліся рупліўцы, гатовыя іх захаваць.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара

Пінскі раён.

■ Выпускныя-2014

ПАД ГУКІ ШКОЛЬНАГА ВАЛЬСА…

Мой школьны выпускны баль быў 25 гадоў таму. Хіба толькі ў той час яны праводзіліся трохі пазней — у канцы чэрвеня. У астатнім, падаецца, нічога не змянілася: тое ж заўсёднае буянне летніх фарбаў, жаданне нарэшце надыхацца напоўніцу паветрам свабоды, адпачыць ад выпускных экзаменаў і адначасова хваляванне ад таго, што праз два тыдні — уступныя. Хаця, не, змянілася…

Да выпускнога балю ў школе ў юнакоў з'яўляліся касцюмы, як правіла, першыя «дарослыя» ў жыцці. У іх потым многія вучыліся пяць студэнцкіх гадоў, жаніліся. Дзяўчаты таксама стараліся набыць практычную сукенку — каб потым можна было выходзіць «у свет». Памятаю, як купкай пехатою ішлі да школы. Проста пасярод дарогі, са стужкамі цераз плячо, букетамі ў руках, каб жыхары пасёлка бачылі, якія мы — выпускнікі! — маладыя і прыгожыя. І ўсе радаваліся гэтаму разам з намі, ветліва ўсміхаліся, махалі рукамі…

На павольны танец я запрасіў Вольгу Іванаўну — маладую настаўніцу, якая падабалася, напэўна, усім хлопцам у школе. Яна заўсёды па-таварыску, як старэйшы дарадца, хвалявалася за нас, выпускнікоў. Доўгія гады гэтыя сяброўскія стасункі не перарываліся з ёй у многіх з нас… Агульны чорна-белы фотаздымак на памяць каля школы — пакуль не села сонца… А потым мы пілі «гарбату» з кубкаў. І пра тое ведалі і бацькі, і настаўнікі, але не «заўважалі». І ў крамах у дні правядзення выпускных баляў тады нічога не знікала з продажу. Насамрэч усё было прыстойна. Мы крышачку хмялелі, але не ад шампанскага… Цёплая ноч, сустрэча світання…

Цяпер да выпускнога балю маладыя людзі, іх бацькі часам рыхтуюцца як да вяселля: эксклюзіўныя строі, лімузіны, рэстараны з адмысловым меню, шакаладныя фантаны, феерверкі… З самой урачыстасці кожны можа весці асабісты анлайн-рэпартаж. Яны больш «прасунутыя», безумоўна, не такія наіўныя, як мы некалі, а, хутчэй, прагматычныя. Што казаць, многія юнакі і дзяўчаты яшчэ да заканчэння школы паспяваюць пабываць не ў адной замежнай краіне, а таму вучаць мовы не дзеля адзнакі ў атэстаце. У большасці сваёй яны ўжо загадзя ведаюць, куды будуць паступаць і дзе і кім пасля працаваць.

Я ні ў якім разе ўсім гэтым не хачу сказаць, што цяперашняя моладзь дрэнная. Яна — іншая. І так, мабыць, павінна быць, каб кожнае новае пакаленне чымсьці адрознівалася ад папярэдняга. Гэта і ёсць рух наперад, няхай часам з нейкімі памылкамі, але жыццё ж не стаіць на месцы. Усё роўна паміж пакаленнямі выпускнікоў ёсць тое, што, бясспрэчна, яднае іх. Гэта школьныя гады і сапраўдныя сябры, якія з'явіліся ў той час. Гэта настаўнікі, якія імкнуліся ўкладаць у маладыя галовы ўсё самае лепшае і разумнае. У кагосьці, магчыма, першае каханне. А цяпер вось — атэстат у руках і стужка «Выпускнік-2014» на плячы. А яшчэ цёплая ноч напярадзе і сустрэча світання… У дарослае жыццё — пад гукі школьнага вальса… У добры шлях, дарагія выпускнікі!

Сяргей РАСОЛЬКА

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Шаноўныя сябры!

Пачалася падпіска на «Звязду» на III квартал 2014 года!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам да свята для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

Індэкс/перыяд	1 месяц	3 месяцы
63850 (для індывідуальных падпісчыкаў)	57 000	171 000
63145 (для ветэранаў ВАВ і пенсіянераў)	51 300	153 900
63858 (для ведамасных падпісчыкаў)	125 000	375 000
63239 (ведамасная падпіска для ўстаноў міністэрстваў адукацыі, культуры і аховы здароўя)	112 500	337 500